# АЛЕСЮ ПЕТРАШКЕВІЧУ - 80



**ПЕТРАШКЕВІЧ АЛЕСЬ ЛЯВОНЦЬЕВІЧ** нарадзіўся 01.05.1930 г. у в. Пярэвалачня Талачынскага раёна ў сялянскай сям'і. Маці, Мар'я Іванаўна Макарэнка, была вядомай на Талачыншчыне льнаводкай, бацька, Лявонцій Іванавіч,— патомным дойлідам (загінуў у 1941). Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны А. Петрашкевіч скончыў 3 класы пачатковай школы. У 1948 г. скончыў Забалоцкую сямігадовую, у 1951 — Коханаўскую сярэднюю школу. У 1955 скончыў БДУ, атрымаў дыплом юрыста. З 1954 працаваў у ЦК ЛКСМБ інструктарам, загадчыкам лектарскай групы, намеснікам загадчыка аддзела. З 1961 у ЦК КПБ: інструктар, загадчык сектара (1963—67), загадчык аддзела культуры (1976—79). Рэктар Менскага інстытута культуры (1975—76). З 1967 адказны сакратар, у 1973—75 і ў 1979—91 намеснік галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. З 1991 кіраўнік арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці пры Міністэрстве культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Сябра Рады СП Беларусі (з 1991). Старшыня Беларускага фонду славянскага пісьменства і славянскіх культур (з 1991). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўнага Савета УССР, медалём Ф. Скарыны, іншымі медалямі.

Творчы почырк А. Петрашкевіча як публіцыста, фельетаніста і сатырыка пачаў складвацца ў 50-я гады (першыя публікацыі ў рэспубліканскім друку датуюцца 1954). Пільнае вока, добры стыль, трапнае слова вылучалі яго праблемныя публікацыі.

Першы мастацкі твор — сатырычнае апавяданне «Кары егіпецкія», з якога потым нарадзілася камедыя «Адкуль грэх» (1970, пастаўлена Беларускім тэатрам імя Я. Купалы).

«Праблемы веку» (алкагалізм, бюракратызацыя апарата кіравання, разбурэнне прыроды і эрозія маральных устояў грамадства) раскрывае ў драмах «Трывога» (1974, пастаўлена Беларускім тэатрам імя Я. Коласа, іншымі тэатрамі на Беларусі і за яе межамі), «Соль» (1981, ставілася Рускім драматычным тэатрам БССР, у тэатрах Украіны), сатырычных камедыях «Злыдзень» (1974, пастаўлена Магілёўскім абласным тэатрам драмы і камедыі) і «Укралі кодэкс» (1976, ставілася ў Гомельскім абласным драматычным тэатры, у тэатрах Віцебска, Берасця, Харкава і інш.).

Распрацоўвае гістарычную тэматыку. П'еса «Напісанае застаецца» (1979, пастаўлена ў Беларускім тэатры імя Я. Купалы і ў Гародні) пра Ф. Скарыну. У ёй услаўляецца сіла слова, бескампраміснасць, вернасць сваім перакананням, любоў да роднага краю, народа, мовы.

У трагедыі «Русь Кіеўская» («Гора і слава», 1982, пастаўлена Крымскім рускім драматычным тэатрам) асвятляецца перыяд хрышчэння Русі, паказваецца трагізм і непазбежнасць рашучай ломкі старых устояў і звычаяў. Аўтар драмы «Мост упоперак ракі» (1986), п'есы-фантасмагорыі «Куды ноч, туды сон» (1987). Гістарычная хроніка «Змова» (напісана ў 1983, ставілася ў Крымскім тэатры) прысвечана падзеям Кастрычніка.

А. Петрашкевіч звяртаецца і да тэмы Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху (трагедыя «Злавеснае рэха», 1984, пастаўлена Магілёўскім абласным тэатрам драмы і камедыі). Да 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Беларускі тэатр юнага гледача паставіў у многім біяграфічную драму «У спадчыну — жыццё». Тэме партызанскай і падпольнай барацьбы моладзі прысвечаны пяцісерыйны тэлевізійны фільм «Нас выбраў час» (1976—78, сцэнарый А. Петрашкевіча і У. Халіпа). Аўтар сцэнарыя мастацкай кінастужкі «Нядзельная ноч» (1977), лібрэта оперы «Новая зямля» паводле паэмы Я. Коласа (пастаўлена Беларускім тэатрам оперы і балета: тая ж паэма была інсцэніравана для Беларускага радыётэатра), гістарычнай драмы пра Ф. Скарыну «Прарок для Айчыны» («Полымя, 1990, № 8; з 1992 па ёй пастаўлены тэлеспектакль у дзвюх частках). Гістарычныя п'есы Алеся Петрашкевіча склалі зборнікі "Воля на крыжы" (2000) "Здрапежаная зямля" (2003).

Творам драматурга ўласцівы публіцыстычнасць, сцэнічнасць, дынамізм сюжэту, вострая інтрыга, дакладнасць моўнай характарыстыкі вобразаў, спалучэнне народнага гумару са з'едлівай сатырай. Выступае ў друку з фельетонамі і публіцыстычнымі артыкуламі. Піша пад псеўданімамі Алесь Аляксееў, Алесь Тутэйшы, Алесь Шпак і інш.

Драматург, празаік, публіцыст, кінасцэнарыст. Сябар СП Беларусі з 1974. Сябар Саюза журналістаў Беларусі з 1961. Кандыдат гістарычных навук (1967). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976; за ўдзел у выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі).

Жыве ў Менску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ